# ГЕРОІ ОБАЛЬСКАГА ПАДПОЛЛЯ



*"Юныя мсціўцы"*
*Зіна Партнова*



*"Юныя мсціўцы"*
*Фруза Зянькова*

У мірны час станцыя Обаль, якая знаходзіцца паміж Полацкам і Віцебскам, нічым не вылучалася, але ў ваенны – на яе долю выпадалі цяжкія выпрабаванні.

У 1918 г. не прайшлі далей гэтага чыгуначнага вузла і ракі Обаль кайзераўскія полчышчы. У пачатку 1920 г. прыкладна на тых жа рубяжах канчаткова спыніўся наступальны парыў інтэрвентаў-пілсудчыкаў. Магутнае полымя барацьбы з акупантамі разгарэлася ў Обалі і яе наваколлі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

У ліку тых, хто загінуў, змагаючыся з гітлераўцамі, пераважную колькасць складалі вучні мясцовай сярэдняй школы. Сабраныя матэрыялы аб гэтых падзеях далі магчымасць у 1952 г. стварыць невялікі музей, які з году ў год папаўняўся новымі экспанатамі. Указамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1 ліпеня 1958 г. «За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны кіраўніку падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая дзейнічала на станцыі Обаль Віцебскай вобласці». **Ефрасінні Савельеўне Зяньковай** прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Такое ж званне пасмяротна прысвоена і члену арганізацыі **Зінаідзе Мартынаўне Партновай**.

Найболтi актыўныя члены арганізацыі: Азоліна Ніна Адольфаўна, Дзяменцьева Марыя Сяргееўна, Езавітаў Уладзмір Іванавіч, Езавітаў Яўгеній Яфімавіч. Лузгіна Марыя Піліпаўна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (усе пасмяротна). Ордэнам Айчыннай вайны I ступені адзначаны подзвігі Аляксеева Мікалая Піліпавіча (пасмяротна), Барбашова Аркадзя Мікалаевіча, Давыдавай Ніны Максімаўны (пасмяротна), Дзяменцьевай Надзеі Сяргееўны (пасмяротна), Езавітава Ілы Васільевіча, Лузгіной Антаніны Піліпаўны (пасмяротна), Лузгіной Зінаіды Дзмітрыеўны (пасмяротна), Маркіянава Барыса Кірылавіча, Слышанкова Фёдара Фёдаравіча (пасмяротна), Шашковай Валянціны Мікалаеўны (пасмяротна).

Подзвігу Обальскіх падпольшчыкаў прысвечаны дзве п’есы, кнігі, зборнікі артыкулаў, матэрыялы, змешчаныя ў часопісах і газетах. Але болышасць аўтараў, на жаль, не выкарыстала дакументы, якія ёсць у архівах, таму ў літаратуры шмат разнабою, часам прыводзяцца не зусім дакладныя факты. Ніхто з аўтараў публікацый не дае стратэгічнай і сацыяльна-гістарычнай ацэнкі гэтага абарончага вузла.

## ОБАЛЬСКІ ВУЗЕЛ СУПРАЦІЎЛЕННЯ

Станцыя Обаль размешчана на чыгунцы, якая цягнецца ад Рыгі праз Смаленск на Маскву і ад Арла на Валгаград. Праз Обаль праходзіць і аўтамагістраль Рыга – Масква. Стратэгічнае значэнне гэтых найкарацейшых шляхоў з захаду на ўсход асабліва ўзрасло ў 1942 – 1943 гадах: на перагоне Полацк – Віцебск знаходзілася адзіная вадакачка. Усе цягнікі тут запраўляліся вадой. Абарончае значэнне мелі чыгуначныя і аўтадарожныя масты праз р. Обаль. Іх ліквідацыя адразу спыняла рух на абедзвюх магістралях. Не менш важным было і шасэ, якое звязвала Обаль з мястэчкам Ула, дзе быў адзіны мост праз Заходнюю Дзвіну паміж Полацкам і Віцебскам. За гады Савецкай улады Обальскі сельсавет ператварыўся ў прамысловую зону Сіроцінскага раёна. Вырасл карпусы новых заводаў: цагельнага, тарфянога, ізаплітачнага, ільнозавода; электрастанцыя, лесапілка; з'явіліся пад'язныя шляхі да іх. Усё гэта ствარала магчымасць для манеўрыравання вагонамі, павялічыла ваеннае і стратэгічнае значэнне станцыі.

Трываласць абарончай пазіцыі вызначаецца не толькі яе ўдалым размяшчэннем, але і людскімі рэсурсамі. Такія сілы былі ў Обалі. Былую Петрапаўлаўскую і сумежныя з ёй воласці Віцебскай губерні ў большасці сваёй насялялі малазямельныя сяляне. У палацы маёнтка захаваўся падвал, дзе да ўмураваных у сцены кольцаў прыкоўвалі «бунтаўшчыкоў». Нядзіўна, што ўстанаўленне Савецкай улады на Обальшчыне адбылося хутка і без хістанняў. Вялікую работу па палітычнай асвеце, патрыятычнаму і антырэлігійнаму выхаванню жыхароў пасёлка праводзіла Обальская школа сялянкай моладзі, заснаваная ў 1924 г.

Па пуцёўках камсамола сюды прымаліся дзеці батракоў і беднякоў Полацкай акругі, якія скончылі 4 класы. Вучні, у асноўным камсамольцы, актыўна працавалі сярод насельніцтва. Ва ўсіх вёсках былі створаны чырвоныя куткі, дзе праводзіліся заняткі па ліквідацыі непісьменнасці, чыталіся газеты, кнігі, выпускаліся насценгазеты. Добрыя традыцыі, назапашаныя педагогамі і камсамольцамі ШСМ па выхаванню падрастаючага пакалення, захаваліся і атрымалі далейшае развіццё ў Обальскай сямігадовай, а потым сярэдняй школе. У 30-я гады калектыў настаўнікаў многа часу адводзіў патрыятычнаму выхаванню як дзяцей, так і дарослага насельніцтва. Пад уражаннем эпапеі чэлюскінцаў у 1934 г. педсавет школы зацвердзіў спецыяльны план работы па выхаваню юных патрыётаў. З гэтай мэтай выкарыстоўвалі магчымасці кожнага ўрока, кожнага прадмета, адпаведна была перагледжана і пазакласная работа. Атрымліваючы даходы са свайго ўчастка, школа набыла вялікую колькасць літаратуры па патрыятычнай тэматыцы. Чытанне кніг стала для вучняў абавязковым. Практыкаваліся чытанні ўголас не толькі з дзецьмі, але і з жыхарамі навакольных вёсак. У 1935 г. Наркамасветы БССР прэміраваў школу кінаперасоўкай. Кожны аўторак і пятніцу дэманстраваліся фільмы. Перад сеансамі для дарослых праводзіліся палітагляды.

Выхаванню любві да Радзімы спрыяла і знаёмства вучняў з дасягненнямі работнікаў сельскай гаспадаркі. Штогод школьнікі наведвалі самі прымалі ўдзел у выстаўках, прысвечаных дню ўраджаю. Рэгулярна арганізоўваліся экскурсіі ў Віцебск. У першай палавіне 30-х гадоў вучні на самастойна зробленыя грошы, а таксама атрыманыя ад калгасаў і ўстаноў, тры разы ездзілі ў Маскву, двойчы ў Ленінград. Каб выхаваць у дзяцей цікавасць да працы, у школе быў праведзены эксперымент. Вучням выдалі працоўныя кніжкі, у якія запісвалі работу на прышкольным участку ў вясенне-летні перыяд. У выніку амаль усе школьнікі атрымалі бясплатнае ці па зніжаных цэнах снеданне. Даходы ад прышкольнага ўчастка падвоіліся. А галоўнае – дзеці з большай увагай пачалі адносіцца да працоўнай кніжкі, у іх выхоўвалася цікавасць да калектыўнай працы. Палымяны патрыятызм насельніцтва ператварыў Обаль у гады выпрабаванняў у моцны вузел супраціўлення.

## У ОБАЛІ НЕАБХОДНА ПАДПОЛЛЕ

Акупанты захапілі Обаль і трывала замацаваліся. Акрамя воінскага гарнізона, у складзе якога было ад 500 да некалькіх тысяч чалавек, тут размясціліся дзве афіцэрскія школы перападрыхтоўкі артылерыстаў і танкістаў, камендатура, аддзяленне гестапа, злучэнне «добраахвотнікаў» – уласаўцаў і вялікі атрад паліцаяў на чале са здраднікам Радзімы М. Экертам. У вёсцы Ушалы пад выглядам сельскага самакіравання стварылі абшчыну. Тэрыторыя, дзе знаходзіўся гарнізон, была абгароджана калючым дротам і акопамі, умацавана агнявымі пунктамі. У такім узброеным да зубоў фашысцкім логаве савецкаму камандаванню, партызанскім атрадам, якія пачалі фарміравацца, неабходна было мець пільныя вочы, чуткія вушы, адданыя сэрцы. Вось чаму па ініцыятыве Сіроцінскага падпольнага райкома партыі і была створана Обальская падпольная камсамольская арганізацыя.

Насельніцтва, і ў першую чаргу моладзь, пачало барацьбу з акупантамі адразу пасля заняцця Обалі. Камсамольцы збіралі зброю, боепрыпасы, хавалі раненых, дапамагалі акружэнцам. З'явіліся лістоўкі.

Работніца віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» камсамолка Фруза Зянькова, якая вярнулася ў сваю родную вёску Ушачы, што непадалёку ад Обалі, пачала шукаць сувязь з партызанамі. Яе брат Мікалай знаходзіўся ў атрадзе імя Варашылава, размешчаным у Шашанскіх лясах.

Неўзабаве на сустрэчу з Е. Зяньковай прыйшоў палітрук роты (потым камісар атрада) Барыс Кірылавіч Маркіянаў. Выпускнік Обальскай сярэдняй школы 1938 г., выдатнік, актыўны камсамолец Б. К. Маркіянаў добра ведаў вучняў і былых выпускнікоў. Разам з Фрузай Зяньковай, якая скончыла ў свой час сумежную Лявонаўскую сямігодку, яны пачалі асцярожна падбіраць кандыдатуры для прыёму ў падпольную камсамольскую арганізацыю. Пёршымі яе членамі сталі Марыя Дзяменцьева, Марыя Лузгіна, Уладзімір, Ілья і Яўгеній Езавітавы, Валя Шашкова, Ціна Азоліна, Зіна Ііартнова, Потым гэтыя камсамольцы складі камітэт, які ўзначаліла дзевятнаццацігадовая Ефрасіння Зянькова. Ва ўспамінах яна пісала: *«Амаль усе падпольшчыкі былі сябрамі, разам вучыліся ў Обальскай школе»* (Дружба народов, 1958, № 10). Каля 30 чалавек уваходзіла ў арганізацыю.

Першы пераднавагодні сход – 1 студзеня 1942 г. – лічыцца днём яе заснавання. Падпольшчыкам растлумачылі, што іх работа ў Обалі больш патрэбная і важная, чым пераход да партызан, куды імкнуліся многія з іх. Усім прапанавалі пайсці працаваць да немцаў. Рабочымі торфазавода сталі Яўгеній Езавітаў і Марыя Лузгіна, цагельнага – Уладзімір Езавітаў, ільнозавода – Зінаіда Лузгіна, Марыя і Дзмітрый Хрыбценкі. Мікалай Аляксееў выказаў жаданне паранейшаму быць стрэлачнікам. У афіцэрскую сталовую чысціць агародніну ўладкавалася настаўніца Ніна Давыдава і вучаніца з Ленінграда, якая прыехала ў госці да дваюраднай сястры, Зіна Партнова. Абедзве нядрэнна ведалі нямецкую мову. У камендатуру здолела паступіць перапісчыцай Ніна Азоліна. Нямецкай мове навучыў яе бацька, выхадзец з Прыбалтыкі. У абшчыну памочнікам рахункавода прынялі Фрузу Зянькову.

Добра наладжаная сувязь з партызанамі давала магчымасць перадаваць тэрміновыя звесткі ў кароткі час. Месцам абмену інфармацыяй стаў «маяк» – тапаграфічная вышка, прыкладна на паўшляху да вёскі Ушачы. Тут жа падпольшчыкі прымалі прысягу ў прысутнасці прадстаўніка ад партызан. Акрамя збору і адпраўкі ў лес зброі і боепрыпасаў (нават ручнога і станковага кулямётаў), камсамольцы вялі прапагандысцкую работу. Валодзя Езавітаў раздабыў партатыўны радыёпрыёмн'ік і арганізаваў слуханне зводак Савінфармбюро пад дахам свайго дома ў Зуях. (Бацька яго быў обальскім старастам.) Вытрымкі са зводак друкаванымі літарамі перапісвала Марыя Лузгіна і іншыя. Такія «плакаты», а таксама лістоўкі і газеты, што атрымлівалі з лесу, падкідвалі жыхарам, клеілі на слупах. Падполынчыкі цікавіліся настроем «добраахвотнікаў». У жніўні 1942 г. тры з іх перайшлі да партызан. Фашысты заўважылі ў размяшчэнні «добраахвотнікаў» Марыю Лузгіну і яе сястру Антаніну, арыштавалі іх і зверскі катавалі. Знявечаных, са скручанымі калючым дротам рукамі дзяўчат вывелі для публічнага расстрэлу. Патрыёткам абяцалі памілаванне, калі яны шчыра аб усім раскажуць. У адказ Марыя горда кінула палачам: *«Страляйце! Нас смерць не пужае! На нашых магілах паставяць помнікі. А вашы арастуць бур'яном!»* Цаною жыцця сёстры Лузгіны выратавалі арганізацыю.

## АСНОЎНАЯ РАБОТА— РАЗВЕДКА

Кругласутачна вялі Обальскія падполтіхыкі аператыўную разведку. Яны выяўлялі размяшчэнне агнявых пунктаў і абарончых збудаванняў, перамены ў колькасным складзе гарнізона. Перадавалі спісы паліцаяў, асоб, якія падлягалі мабілізацыі, папярэджвалі аб карных экспедыцыях (калі, колькі карацеляў, дзе высадзіліся, як узброены), часам паведамлялі нават дату пачатку наступлення. Дзякуючы такім звесткам, партызаны неслі меншыя страты, чым акупанты.

Асабліва пільна падполыпчыкі сачылі за перавозкай людзей і грузаў па абедзвюх магістралях. На чыгунцы вялі разведку Мікалай Аляксееў і Фёдар Слышанкоў. Дапамагаў ім стары чыгуначнік Елісеенка.

Страты, якія наносіла фашыстам дакладная разведка, можна праілюстраваць наступным прыкладам. М. Аляксёеў разгадаў хітрасць акупантаў: пад цюкамі сена яны перавозілі танкі на Курскую Дугу. Па яго сігналу, перададзенаму ў атрад, савецкія лётчыкі разбамбілі толькі на тэрыторыі Сіроцінскага раёна чатыры такія эшалоны. Колькі ж «тыграў» і «пантэр» не дайшло да месца рашаючых баёў 1943 г.?! Гэта быў удар не тактычнага, а стратэгічнага значэння! Праз 15 год у Таліне выпадкова сустрэліся Е. Зянькова і генерал-маёр В. Васільеў, які кіраваў аперацыяй «Танкі пад сенам».

## ОБАЛЬСКІЯ ФЕЕРВЕРКІ

Каб пазбегнуць правалу, дыверсіі праводзіліся на некаторай адлегласці ад Обалі. Палілі і ўзрывалі масты, аўтамашыны; цягнікі мініравалі магнітнымі мінамі з гадзіннікавым механізмам, што дазваляла пускаць пад адхон паязды далёка ад станцыі. Паблізу гарнізона ўсе дыверсіі звычайна адносілі да дзеянняў партызан. Па архіўных звестках, у 1942 – 1943 гг. арганізацыя правяла болып за 20 толькі буйных дыверсій. Вось некаторыя з іх.

Моцны выбух адбыўся ў самой Обалі. Замініраваны М. Аляксеевым эшалон затрымаўся на станцыі з-за таго, што партызаны ўзарвалі суседні участак чыгункі, а тым часам прыбылі яшчэ два эшалоны з гаручым. Узрыўной хваляй з будынка вакзала была сарвана частка даху. Амаль на двое сутак чыгунка выйшла са строю.

3 жніўня 1943 г. пасля заканчэння рабочага дня на прадпрыемствах Обалі адбыліся дыверсіі. Зінаіда Лузгіна, Дзмітрый і Марыя Хрыбценкі у сушылку льнозавода пранеслі міны і ўзрыўчатку, дзе ў 18 гадзін адбыўся выбух. Цалкам згарэлі завод і размешчаная на яго тэрыторыі электрастанцыя. У 18 гадзін 30 мінут Ілья Езавітаў узарваў лакаматыў на нагельным заводзе. Амаль адначасова былі знішчаны два матавозы на торфазаводзе. Адразу ж, як і было дамоўлена, распусцілі слых, што ў Обаль пранікла група партызан.

Аднак на цагельным заводзе падазрэнне пала на Ілью Езавітава. Назаўтра хлопец пайшоў касіць траву і калі заўважыў паліцая, то зразумеў, у чым справа. Хутка пабег да лесу. Далей ён змагаўся ў партызанскім атрадзе.

Вялікую страту нанесла Обальскаму чыгуначнаму вузлу дыверсія на водапомпавай станцыі, якая знаходзілася пад узмоцненай аховай. Аперацыю правяла Ніна Азоліна, працаваўшая ў камендатуры. У партызанскім атрадзе вырабілі невялікую, але моцную міну ў выглядзе кавалка антрацыту, якую ёй прынесла Ефрасіння Зянькова. Ніна прайшла на тэрыторыю вадакачкі быццам бы для таго, каб падлічыць запасы вугалю, і падкінула туды свой «антрацыт». 19 жніўня 1943 г. міна трапіла ў топку, і кацёл узарваўся. Рух цягнікоў быў спынены на восем дзён. А наша авіяцыя атрымала выдатныя аб'екты для прыцэльнага бомбакідання. У архіве захавалася данясенне аб выбуху: «*Вызначыўся: нягласнік пад псеўданімам Гаўрылаў*». Гэта быў псеўданім Ніны Азолінай. Вялікае агітацыйнае значэнне мелі тыя дыверсіі, у час якіх падпольшчыкі каралі гітлераўскіх военачальнікаў. Так, у аўтамабіль зондэрфюрэра Бормана Валодзя Езавітаў паклаў міну.

У пачатку жніўня падрыхтаваная дыверсія ў афіцэрскай сталовай сарвалася. Зіна Партнова, якая там працавала, змагла ўцячы разам з дзевяцігадовай сястрой Галяй да партызан. Ніну Давыдаву пасля жорсткіх катаванняў расстралялі, але яна не выдала арганізацыю.

## ДАРОГА У БЕССМЯРОТНАСЦЬ

У вогненныя летнія дні 1943 г. гестапаўцы і паліцэйскія пры актыўным удзеле Экерта высачылі падпольшчыкаў. 28 жніўня Обаль, Зуі, Масцішча, Ферму і Ушачы адначасова акружылі фашысты. Былі арыштаваны Уладзімір і Яўгеній Езавітавы, Дзмітрый і Марыя Хрыбценкі, Зінаіда Лузгіна, Зоя Сафончык, Мікалай Аляксееў, Фёдар Слышанкоў, Ніна Азоліна і іх сваякі. Ефрасінню Зянькову, якая знаходзілася ў Полацку, папярэдзіў Аркадзь Барбашоў. Абодва яны пайшлі ў атрад. Спробы гітлераўцаў зламіць баявы дух арыштаваных зверскімі катаваннямі не далі вынікаў. Знявечаная Ніна Азоліна на адным з допытаў, узняўшы левую руку, адважна кінула ў твар палачам: *«Так, не адмаўляюся! Гэтай рукой я ўзарвала вадакачку!»* І, паказваючы на мёртвую, пакалечаную правую руку, дадала: *«А гэтай збіралася ўзарваць камендатуру! Больш я нічога не скажу!»* Такую ж стойкасць і вытрымку праявілі ўсе падпольшчыкі. 5 кастрычніка 1943 г. пасля саракадзённых катаванняў іх расстралялі каля вёскі Баравуха-другая. Героі паміралі з любімай пёсняй на вуснах: «Орленок, орленок, взлети выше солнца..!» Разам з імі расстралялі як заложніцу маці Е. С. Зяньковай Антаніну Антонаўну.

## ПОДЗВІГ «ДЗЯУЧЫНКІ З КОСКАМІ»

Выдатніца адной з ленінградскіх школ Зіна Партнова ў партызанскім атрадзе вырашыла стаць разведчыцай. Дзяўчынка праявіла выключныя здольнасці і працавітасць, добра валодала савецкай і нямецкай агнястрэльнай зброяй. Незвычайная фенаменальная памяць дазволіла ёй дакладна ўзнавіць сістэму абароны немцаў у Лявонаве. Па яе разведданых гэты абарончы вузел быў разгромлены амаль без страт.

17 снежня 1943 г. пры выкананні чарговага задання ў раёне Обалі Зіну пазнала здрадніца з в. Масцішча і выдала паліцаям. Больш месяца катавалі фашысты шаснаццацігадовую дзяўчыну. Яна нічога не расказала ні аб сабе, ні аб падпольшчыках і партызанах. Следчы гестапа ў Гаранах обер-лейтэнант Густаў Краўзе на допыце пагражаючы Зіне парабелумам, які быў пастаўлены на засцерагальнік, быццам бы незнарок паклаў яго на стол, а сам адвярнуўся. Зіна, ведаючы «сакрэт» зброі, з аднаго выстралу забіла гестапаўца.

Другую кулю атрымаў афіцэр, які прыбег, трэцюю – часавы. Але сілы былі няроўныя. Раненую гераіню працягвалі катаваць.

Дзяўчыну палілі гарачым жалезам, ёй выкалалі вочы, абрэзалі вушы. Знявечаную, з дошкай на грудзях і надпісам Партызанская бандытка» Зіну вадзілі па вёсках для апазнання. Але ніхто не назваў яе імя. У архіўных дакументах ёсць запіс: «*Па агентурных звестках Партнова павешана*». Гэта здарылася ў пачатку лютага 1944 г.

Сваёй мэтанакіраванасцю, бясстрашнай, самаадданай барацьбой супраць фашысцкіх захопнікаў героі Обальскага падполля ўнеслі значны ўклад у агульную барацьбу савецкага народа.

17 год, як звер ад паляўнічага, хаваўся ад савецкага правасуддзя начальнік обальскай паліцыі. З Мікалая Артуравіча Экерта ён ператварыўся ў Мікалая Іванавіча Невядомскага. Спачатку ўцёк у Рыгу, адтуль у Арэнбург, дзе яго і злавілі. У Обалі асудзілі і расстралялі. Пошук матэрыялаў аб Обальскіх падполыпчыках і работа па ўвекавечванню іх памяці працягваецца.

*Д. С. Ляшчынскі,*
*былы дырэктар Обальскай школы, кандыдат педагагічных навук*




*Матэрыялы экспазіцыі прысвечаныя вядомай падпольнай камсамольскай арганізацыі "Юныя мсціўцы". Музей Обальскага камсамольскага падполля ©https://probelarus.by*